переносят свою задумку через бумагу или лепную модель в камень, сегодня зачастую выполняют компьютеры и ЧПУ-станки, заменившие карандаш и резец. Кроме того, прослеживается тенденция к утрате авторства художественных произведений из камня, что связано с разделением процессов их производства, а также часто применяемым повторением и «штампованием» уже известных образцов.

Подводя итоги вышесказанному, сделаем вывод, что в конце XX – начале XXI в. расширяется диапазон изготавливаемых из природного камня изделий декоративно-утилитарного назначения. В оформление внутреннего убранства активно вводятся камины с каменной облицовкой порталов, интерьерные фонтаны и водопады, разнообразные предметы резного декора. На новом уровне развивается искусство каменной мозаики, как римской, так и флорентийской, и становится широко применяемым в различных вариациях.

Совершенствование технического уровня камнеобработки определило новые вехи в использовании художественно-выразительных особенностей материала. Развиваются сложившиеся ранее технические приёмы, раскрывающие потенциальные возможности природного камня, наблюдается высокая степень вариативности его применения. Среди популярных приёмов – многокомпонентность каменной палитры, активное комбинирование каменных элементов с различными материалами.

РЕЗЮМЕ

В статье освещаются вопросы эволюции художественного камня в Беларуси в конце XX – начале XXI в. Рассматриваются особенности и примеры произведений декоративно-прикладного искусства из природного камня.

SUMMARY

The article presents the evolution of artistic stone in Belarus in the late XX – early XXI century. There are considered features and examples of works of decorative and applied art made of natural stone.

***Казаніна В. Ю.***

## АНТЫКВАРНЫЯ ПРАДМЕТЫ СА СТАТУСАМ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ Ў МУЗЕЯХ БЕЛАРУСІ XXI СТ.

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў*

*(Паступіў у рэдакцыю 17.02.2020)*

У XXI ст. Рэспубліка Беларусь імкнецца надаваць асаблівую ўвагу ахове помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны, этнакультурнай ідэнтычнасці насельніцтва, а таксама відам мастацтва, якія сімвалізуюць адзначаную ідэнтычнасць. У сувязі з гэтым шэраг старажытных каштоўнасцей (адметныя элементы гарадскога ландшафту і архітэктуры; гістарычны экстэр'ер і інтэр'ер магнацкіх рэзідэнцый Беларусі часоў Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага; шэдэўры выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва нашай краіны), які раней цікавіў даволі абмежаванае кола навукоўцаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(мастацтвазнаўцаў, этнографаў, гісторыкаў і краязнаўцаў), у XXI ст. прыцягвае ўвагу ўсё больш шырокіх грамадскіх колаў як у Беларусі, так і за яе межамі.

Мэта артыкула – прааналізаваць кантэкст і асаблівасці надання на працягу першых двух дзесяцігоддзяў XXI ст. статусу гісторыка-культурнай спадчыны шэрагу антыкварных мастацкіх артэфактаў, якія экспануюцца ў дзяржаўных музеях Рэспублікі Беларусь.

Ва ўсіх краінах свету на сённяшні дзень гісторыка-культурная спадчына – своеасаблівая духоўная аснова легітымнасці дзяржаўнасці і суверэнітэту краіны, без якога складана пацвердзіць сваё права на статус незалежнай дзяржавы. У кантэксце гісторыі і тэорыі мастацтва асабліва значна тое, што пад «гісторыка-культурнай спадчынай» маюцца на ўвазе розныя праявы мастацтва кожнай супольнасці, народа, рэгіёна, а таксама ўключэнне іх у навакольны (прыродны і сацыяльны) ландшафт. Спадчына падкрэслівае індывідуальнасць кожнай краіны, народа, этнасу, а таксама канстатуе прыналежнасць усіх людзей да адзінай сусветнай супольнасці.

У Беларусі праца па наданні статусу гісторыка-культурнай спадчыны элементам мастацтва і культуры пачалася пасля далучэння краіны да дзвюх канвенцый ЮНЕСКА: «Аб ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны» (1972) і «Аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны» (2003). Першая з іх была зацверджана Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь № 2124-XI ад 25 мая 1988 г., другая – Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 627 ад 29 снежня 2004 г. Такім чынам, абедзве канвенцыі афіцыйна ратыфікаваны ў Беларусі і накіраваны на ахову каштоўнасцей мастацка-культурнай прасторы нашай краіны, куды ўключаюцца ландшафт, архітэктура, выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, мастацтва вуснай традыцыі, а таксама звязаныя з імі характэрныя паводзінскія мадэлі.

Характарызуючы з'явы, якія належыць ахоўваць, члены ЮНЕСКА сцвярджаюць, што культурная і прыродная спадчына чалавецтва – гэта «помнікі: творы архітэктуры, манументальнай скульптуры і жывапісу, элементы або структуры археалагічнага характару, надпісы, пячоры і групы элементаў, якія маюць выдатную ўніверсальную каштоўнасць з пункту гледжання гісторыі, мастацтва або навукі; ансамблі: групы ізаляваных або аб'яднаных будынкаў, архітэктура, адзінства або сувязь з пейзажам якіх уяўляюць выдатную ўніверсальную каштоўнасць з пункту гледжання гісторыі, мастацтва або навукі; славутыя месцы: творы чалавека або сумесныя тварэнні чалавека і прыроды, а таксама зоны, уключаючы археалагічныя месцы, якія ўяўляюць універсальную каштоўнасць з пункту гледжання гісторыі, эстэтыкі, этналогіі, або антрапалогіі» [3].

Як адзначаюць спецыялісты па эстэтыцы, мастацтву вуснай традыцыі і арт-бэкграўнду Беларусі, спасылаючыся на нарматывы ЮНЕСКА [8]: «Нематэрыяльная культурная спадчына (ад англ. 'oral and intangible heritage of humanity' – «вусная і нематэрыяльная спадчына чалавецтва») – узоры вуснай народнай творчасці і тэхналогіі рамёстваў, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне, пастаянна прайграваюцца супольнасцямі і суполкамі ў сувязі з прыродным асяроддзем і гісторыяй, якія фарміруюць у іх пачуццё самабытнасці і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пераемнасці, спрыяюць творчасці людзей і павазе культурнай разнастайнасці. Асноўная адзнака такой спадчыны – жывое бытаванне традыцыі, яе існаванне ў побыце народа» [1, с. 11].

Паколькі ў абедзвюх канвенцыях гаворка ідзе аб прадметах і каштоўнасцях, якія міжнародная супольнасць прынцыпова жадае захаваць, асаблівую ўвагу пры выкананні гэтых міжнародных дагавораў прыцягваюць артэфакты і з'явы, што на працягу доўгага часу шукаюць, збіраюць і набываюць, экспануюць, абмяркоўваюць, уводзяць у абарот на рынку знаўцы і аматары прыгожага, прадстаўнікі прафесійнай, а таксама экспертнай супольнасці, каб атрымаць абаротныя сродкі для набыцця новых экзэмпляраў. Такога роду каштоўнасці звычайна аб'яднаны ў калекцыі, а для забеспячэння самой сістэмы іх абарачэння ў грамадстве задзейнічаны рынкавыя адносіны. Гэтыя каштоўнасці, якія ўспрымаюцца як аб'екты, былі народжаны ў жыццёвай прасторы кожнага народа, які на працягу многіх стагоддзяў захоўваў іх.

Сакратарыятам ЮНЕСКА даўно фармуецца «Спіс сусветнай спадчыны». З беларускіх аб'ектаў такога роду статус першымі атрымалі: Белавежская пушча, Мірскі замак, палац Радзівілаў у Нясвіжы і Геадэзічная дуга Струвэ. Сёння разглядаюцца Аўгустоўскі канал, Спаса-Праабражэнская (Полацк) і Каложская (Гродна) цэрквы, касцёлы ў Сынкавічах, Мураванцы, Камаях, а таксама палескае драўлянае дойлідства XVI – XIX стст. [4]. Гэтыя помнікі гістарычнай нерухомасці ў XXI ст. або ўжо актыўна функцыянуюць як дзяржаўныя музеі, або толькі ўводзяцца ў музейную сферу. У XX ст. Мірскі замак павольна ператвараўся ў закінутыя руіны, а ў нясвіжскім палацы Радзівілаў размяшчаўся санаторый. Сёння гэтыя помнікі гісторыі і архітэктуры прымаюць шматлікіх турыстаў і экспануюць прадметы антыкварнага мастацтва, а таксама праводзяць канцэртныя і інтэрактыўныя мерапрыемствы, прыносячы адчувальны прыбытак у бюджэт Рэспублікі Беларусь.

Увага антыквараў да нерухомых помнікаў прыцягваецца ў меншай ступені, паколькі продажу на аўкцыёнах, а таксама абмену і размяшчэнню ў камерцыйных экспазіцыях збораў старадаўняга мастацтва падлягаюць шматлікія рухомыя артэфакты: карціны, гравюры, абразы, кнігі, мэбля, дробная пластыка, ювелірныя ўпрыгажэнні, друкі, манеты, зброя, даспехі і г. д. Такога роду рухомай спадчыне таксама вядзецца ўлік. У Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей краіны, які з сярэдзіны 2000-х гадоў вядзе Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь [2], пазначана каля пяці з паловай тысяч аб'ектаў (матэрыяльных і нематэрыяльных). На іх распаўсюджваюцца патрабаванні закона «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь» [7, с. 34]. Паколькі рухомыя артэфакты дадзенай катэгорыі звычайна выраблены больш за паўстагоддзя таму, у адпаведнасці з заканадаўствам Беларусі, яны з'яўляюцца антыкварыятам – асабліва значнымі прадметамі, якія маюць эстэтычную, гістарычную, а таксама камерцыйную каштоўнасць.

Зыходзячы з рашэння калегіі Міністэрства культуры № 153 ад 3 снежня 2008 г., пры ўпраўленнях культуры ўсіх абласцей створаны калектывы для атрыбуцыі гісторыка-культурнай спадчыны. У склад такога роду калектываў уваходзяць шматлікія мастацтвазнаўцы, архітэктары, навукоўцы і музейныя ра-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ботнікі. Тое, што яны лічаць каштоўным у сваім рэгіёне, намінуюць на разгляд з боку Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь. Сама ж рада ўяўляе сабой незалежны грамадскі орган, які складаецца з архітэктараў, гісторыкаў, культуролагаў і мастацтвазнаўцаў з навуковымі ступенямі і званнямі. Месца (матэрыяльны артэфакт або помнік нематэрыяльнай творчасці пэўнага рэгіёна) у працэсе намініравання праходзіць экспертызу, разглядаецца на пасяджэнні рады і, пры яго адабрэнні шляхам адкрытага галасавання, атрымлівае адпаведны статус [7, с. 34], а таксама шыфр, пад якім ён аператыўна ўносіцца ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны.

У дадзены спіс уключаны наступныя элементы: архітэктурныя і ландшафтныя нерухомыя помнікі, лакальныя абрады і традыцыі (як нематэрыяльная спадчына народа) розных рэгіёнаў Беларусі, а таксама каля 70 музейных экспанатаў з характарыстыкамі антыкварыяту. Нематэрыяльныя элементы не з'яўляюцца аб'ектам гэтага даследавання, а рэгіянальная статыстыка наяўнасці антыкварыяту (матэрыяльных артэфактаў) са статусам гісторыка-культурных каштоўнасцей у айчынных музеях [2] выглядае наступным чынам (табліца 1).

Табліца 1. Рухомыя гісторыка-культурныя каштоўнасці ў музеях Беларусі

| Вобласці Рэспублікі Беларусь | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Брэсцкая | Віцебская | Гомельская | Гродзенская | Мінская | Магілёўская |
| Колькасць рухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей (артэфактаў і іх калекцый) з шыфрамі | | | | | |
| 3 | 5 | 2 | 21 | 37 | - |
| Колькасць музеяў, у фондах якіх знаходзяцца дадзеныя гісторыка-культурныя каштоўнасці | | | | | |
| 2 | 2 | 2 | 3 | 8 | - |

У пераліку музеяў Беларусі, якія маюць у сваіх фондах гісторыка-культурныя каштоўнасці, прысутнічаюць розныя па статусе і маштабе ўстановы: ад сціплых раённых (Лепельскага краязнаўчага, Клецкага гісторыка-краязнаўчага музеяў) і больш буйных абласных (Брэсцкага краязнаўчага, Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музеяў) да агульнанацыянальных і вельмі маштабных – Нацыянальнага мастацкага музея, Нацыянальнага гістарычнага музея [2]. Відавочна, што самая вялікая колькасць гісторыка-культурных каштоўнасцей належыць не столькі буйным музеям, колькі тым, якія зацікаўлены ў папаўненні калекцый і прадпрымаюць для гэтага актыўныя дзеянні [5].

Зыходзячы з аналізу найбольш вядомых артэфактаў адзначанага дзяржаўнага спісу ў кантэксце іх антыкварна-рынкавага кошту, а таксама мастацкай і гістарычнай значнасці, зробім заключэнне, што гісторыка-культурныя каштоўнасці з музейных фондаў Беларусі даволі розныя па сваім камерцыйным кошце. Напрыклад, у Брэсце статус гісторыка-культурнай каштоўнасці мае невялікая касцяная фігура шахматнага караля і сціплы самшытавы грэбень для валасоў з гісторыка-археалагічнага музея «Бярэсце» (адзінага ў Еўропе археалагічнага музея сярэднявечнага драўлянага ўсходнеславянскага горада XI – XIII стст.). Дадзеныя артэфакты, безумоўна, з'яўляліся вельмі прыцягальнымі для археола-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гаў, краязнаўцаў, гісторыкаў мастацтва і этнографаў, але, разам з тым, наўрад ці зацікавілі сваім рынкавым коштам камерсантаў.

Аднак некаторыя элементы са спісу гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі не могуць не цікавіць айчынных і замежных антыквараў. На сённяшні дзень у Нацыянальным гістарычным музеі Мінска экспануецца шэраг вельмі каштоўных ювелірных вырабаў. Найбольш вядомымі з іх з'яўляюцца: амаль ідэальны па прапорцыях і форме залаты віты бранзалет XII ст. з зааморфнымі канцамі з сярэднявечнага мінскага замчышча і сярэбраны пасавы аксесуар – так званы «Пояс Вітаўта» канца XIV – пачатку XV ст. Бранзалет быў знойдзены археолагамі ў 1951 г. у Мінску, а пояс – у пачатку 1990-х гадоў у вёсцы Літва Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці.

Тыпалогію залатога бранзалета вагой 75,49 г звязваюць з вітымі ўпрыгажэннямі ранняга сярэднявечча Скандынавіі, якія сімвалізуюць асаблівы статус конунгаў і ярлаў (прадстаўнікоў вышэйшай скандынаўскай арыстакратыі) – іх звычайных уладальнікаў. Знойдзены ён на тэрыторыі Мінскага замчышча – месца заснавання летапіснага Менска, упершыню згаданага ў «Аповесці мінулых гадоў» у сувязі з міжусобнымі канфліктамі, якія ў выніку прывялі да бітвы на Нямізе паміж полацкім князем Усяславам і сынамі кіеўскага князя Яраслава Мудрага. Усяслаў паходзіў з так званай «полацкай дынастыі Рурыкавічаў-Рагвалодавічаў», заснавальнік якой Рагвалод прыбыў у сярэднявечную Беларусь сярод варагаў. Каму менавіта належаў дадзены бранзалет у сярэднявечнай Беларусі, сёння можна толькі меркаваць, але, бясспрэчна, гэта была славутая гістарычная асоба.

Сярэбраны пояс вагой у 805,4 г з філігранна выкананым раслінным арнаментам, шматлікімі малюнкамі птушак і васіліскаў таксама быў знойдзены на мінскай зямлі. На думку гісторыкаў, гэты пояс мог быць падораны вялікаму князю Вітаўту крымскім ханам Хаджы-Гірэем, які нарадзіўся ў беларускай Лідзе і быў заснавальнікам Крымскага ханства і дынастыі Гірэяў. Як мяркуюць эксперты, «пояс быў выраблены ў горадзе Кафэ (зараз Феадосія, Украіна), а спражкі да яго – у італьянскай Генуі <...> Складаецца з 11 паясных пласцін, спражкі, наканечніка і дзвюх квадратных накладак. Ён мае прыкметы як лацінскай стылістыкі (форма спражкі і наканечніка), так і ўсходняй арнаментыкі (малюнак птушак і васіліскаў на пласцінах). Усе дэталі пояса выкананы са срэбра, большая іх частка ўпрыгожана пазалотай і чарненнем» [5]. На думку даследчыкаў, такія паясы ў часы Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ў Еўропе належалі вышэйшаму набілітэту і з'ўляліся сімваламі рыцарскай прыналежнасці.

Нават па кошце матэрыялу, з якога былі выраблены гэтыя музейныя прадметы, бранзалет і пояс маюць бясспрэчна высокую рынкавую цану, яе павялічвае гісторыка-культурна-геаграфічны «шлейф». Несумненна, бранзалет і пояс – прыклады так званага эксклюзіўнага музейнага *VIP*-антыкварыяту, што характарызуецца: а) эстэтычнай каштоўнасцю; б) рэдкасцю вырабу; в) гістарычнай і культурнай каштоўнасцю.

У выніку аналізу звестак музейных артэфактаў Беларусі зробім наступныя высновы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Пералічаныя ў артыкуле прыклады музейных артэфактаў Беларусі (танныя дэкаратыўна-прыкладныя вырабы – разьбяная касцяная шахматная фігура і драўляны грабеньчык, а таксама раскошныя залаты бранзалет і сярэбраны пояс) унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей з наданнем аднолькавай (першай) катэгорыі каштоўнасці [2]. Відавочна, што іх рынкавы кошт пры працэдуры ўнясення ў дзяржаўны спіс асабліва не прымаўся пад увагу кваліфікаванымі экспертамі. Галоўны крытэрый пры атрыманні статусу гісторыка-культурнай спадчыны – каштоўнасць і значэнне для гісторыі, культуры і самаідэнтыфікацыі народа.

2. Рэспубліка Беларусь арганізавала дзейсную сістэму аховы прадметаў гісторыка-культурнай спадчыны, якія экспануюцца ў дзяржаўных музеях. Гэта з'яўляецца сведчаннем паслядоўнага руху краіны да агульных імкненняў з боку міжнароднай супольнасці ў напрамку пабудовы справядлівай, бяспечнай і раўнапраўнай агульнасусветнай прасторы.

## ЛІТАРАТУРА


1. Дарашэвіч, Э. Тэорыя фальклору : вучэбна-метадычны дапаможнік / Э. Дарашэвіч. – Мінск : БДУКМ, 2016. – 78 с.
2. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://kultura.by/uploads/files/Gosspisok-sajt-2018-13.03.pdf. – Дата доступу: 20.02.2020.
3. Конвенция об охране всемирного культурного и природного наследия [Электронный ресурс] // ЮНЕСКО. – Режим доступа: http://un.org. – Дата доступа: 20.02.2020.
4. Котлярова, Ж. Игорь Чернявский: о списке ЮНЕСКО, Кодексе о культуре и хозяйском отношении к наследию [Электронный ресурс] / Ж. Котлярова // БелТА. – Режим доступа: https://www.belta.by/interview/view/o-spiske-junesko-kodekse-o-kulture-i-hozjajskom-otnoshenii-k-naslediju-6272/. – Дата доступа: 20.02.2020.
5. Мартинович, Д. «Минский клад», «пояс Витовта» и пистолет 17 века. Чем гордится Национальный исторический музей [Электронный ресурс] / Д. Мартинович. – Режим доступа: https://news.tut.by/culture/523686.html. – Дата доступа: 20.02.2020.
6. Музеі Беларусі=Museums Belarus: інфармацыя аб музеях Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь / склад. А. Сташкевіч [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 2001. – 272 с.
7. Хвир, Н. Состояние и проблемы охраны нематериального культурного наследия Республики Беларусь / Н. Хвир // Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, перайманне : зб. навук. прац / рэдкал. : М. Мажэйка (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2009. – С. 34 – 35.
8. Basic Texts of the 2003 Convention for the Safeguarding of the Intangible Cultural Heritage / original design Baseline Arts Ltd, Oxford, UK. – Luxemburg : UNESCO, 2011. – 103 p.



РЕЗЮМЕ

В статье проанализирован контекст и особенности присвоения в течение первых двух десятилетий XXI в. статуса историко-культурного наследия ряду художественных артефактов, которые экспонируются государственных музеях Республики Беларусь. Статус историко-культурного наследия соотнесён с международными нормативами в данной области.



SUMMARY

The article analyzes the context and the features of acquisition during the first two decades of the XXI century of the historical and cultural heritage status to a number of artifacts which are on display in the expositions of the Belarusian state museums. The status of historical and cultural heritage correlates with international standards in this field.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ